# Парадоксы зменлівай сістэмы

## Архітэктура сюррэалізму ў творах Ігара Карпава



*«Царыца сну і мудрасць ночы», 2013 г.*

Адарвацца ад штодзённай рэальнасці і паглыбіцца ў свет рамантычнай містычнасці, фантастыкі, апынуцца па-за межамі звыклага, традыцыйнага, адчуць энергетыку колераў... Менавіта так можна ахарактарызаваць выставачны праект «Свет сюррэалізму» мастака Ігара Карпава, які дэманструецца ў Мастацкай галерэі «Універсітэт культуры».

Паняцце «сюррэалізм» у выяўленчым мастацтве выклікае асацыяцыі з імёнамі Сальвадора Далі, Рэнэ Магрыта, Хуана Міро. Ігар Карпаў у творчасці робіць адсылку да кожнага з аўтараў. Яго творы — падарожжа ў сусветную гісторыю мастацтваў, філасофскае разважанне над сутнасцю існавання чалавека ў прыродзе.

— У творах я выкарыстоўваю рэальнасць, аднак паралельна абапіраюся на фантастычныя апавяданні, уласныя фантазіі, — расказвае Ігар Карпаў. — Мае кампазіцыі непарыўна звязаны з жыццём, дэманструюць маё бачанне яго зменлівай сістэмы. У некаторых работах праглядаецца эмацыйна-псіхалагічны ўсплёск героя ў і прыроды, абумоўлены колерам і самой тэмай, у некаторых я звяртаюся да сусветнай гісторыі, напрыклад, карціна, прысвечаная Нікало Паганіні. Людзі, якія любяць музыку, знаёмыя з гісторыяй, могуць прачытаць у творы не толькі маё стаўленне да генія, але і этапы жыцця майстра, прасачыць матывы яго галоўных твораў. Я караную Паганіні залатой каронай, таму што да гэтага часу не згасла яго слава як геніяльнага музыкі. Люблю звязваць творы з прыродай і чалавекам. Менавіта такі сінтэз дапамагае атрымаць станоўчы зарад энергіі. Нават калі выкарыстоўваю адценні іроніі, мае творы не пазбаўлены дабрыні і любові.

Мастак сцвярджае, што ў яго «Свеце сюррэалізму» кожны глядач можа адысці ад рэчаіснасці і знайсці шмат новых захапляльных тэм. Паколькі творы шматслойныя, не варта думаць, што асноўная думка — на паверхні. Наадварот, аўтар заклікае абстрагавацца, паглыбіцца ў эпіцэнтр падзей сюжэта і паўзаемадзейнічаць з героямі. Важную ролю Ігар Карпаў надае колерам: да спакойных, пастэльных адценняў звяртаецца зрэдку, выбірае яркія фарбы, якімі вылучае цэнтральныя лініі твора. Мастак насычае творы філасофскімі і рэлігійнымі сімваламі, эксперыментуе і выбірае свабоду экспрэсіі. На палотнах аўтар супрацьпастаўляе стыхіі. Так, у многіх творах узаемадзейнічаюць вада і агонь, неба і мора, пустыня і ўрбаністычная атмасфера, тыгры і слабыя жанчыны... Такім чынам, аўтар заклікае гледача параўноўваць, шукаць у сюжэтах асноўныя акцэнты.

Цікава, што па асноўнай адукацыі Ігар Карпаў архітэктар. Ён праектаваў многія знакамітыя будынкі сталіцы. Мастацтвазнаўцы адзначаюць, што ён чалавек рацыянальны, таму ягонае захапленне сюррэалізмам можа падацца парадаксальным. Але ж сам аўтар падкрэслівае, што яго зварот да сюррэалізму — жаданне паразважаць і раскрыць сябе з новага боку, адысці ад рэчаіснасці і існаваць у іншым, ізаляваным ад «сапраўднага», свеце.

Мноства твораў мастака складана ўспрымаць у адной выставачнай прасторы. У галерэі «Універсітэт культуры» творы размеркаваны ў дзвюх залах: у адной — больш рэлігійных і гістарычных сюжэтаў, у другой — творы, аб'яднаныя тэмай існавання чалавека ў вялікім свеце.

**Вікторыя АСКЕРА**



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ